## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 930:001.89:005.71(476)*

*В. В. ДАНІЛОВІЧ*

# ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ Ў СІСТЭМЕ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 19.11.2013)*

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'яўляецца адной са старэйшых акадэмічных арганізацый, вядучай навуковай установай краіны ў сферы гістарычнай навукі.

Вучоныя інстытута ажыццяўляюць фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні па трох важнейшых напрамках:

– айчыннай і ўсеагульнай гісторыі;

– археалогіі;

– антрапалогіі.

Навукова-даследчая дзейнасць накіравана на вырашэнне трох асноўных задач:

1) арганізацыя фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў;

2) забеспячэнне захавання нацыянальнага гісторыка-культурнага здабытку;

3) шырокая трансляцыя вынікаў навуковых даследаванняў.

Структура інстытута ўключае вучоны савет, дырэкцыю, 3 цэнтры, 11 аддзелаў і 2 сектары. Пры інстытуце дзейнічае Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі, у 92 фондах якога захоўваецца больш 51 тыс. спраў, а таксама адзіны ў краіне Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі, які налічвае звыш 3тыс. справаздач аб палявых даследаваннях.

На сённяшні дзень у інстытуце працуе 105 чалавек, з іх 93 – вучоныя, сярод якіх 12 дактароў (у тым ліку 1 акадэмік) і 53 кандыдаты навук, 8 прафесараў і 23 дацэнты. Маладыя навукоўцы ва ўзросце да 35 гадоў складаюць 22%.

Эфектыўнае развіццё любой навукі немагчыма без наяўнасці кадравага патэнцыялу. Важнай формай падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі з'яўляюцца аспірантура і дактарантура інстытута, дзе вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях 07.00.02 – айчынная гісторыя; 07.00.06 – археалогія; 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, антрапалогія; 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; 03.03.02 – антрапалогія. На 1 снежня 2013 г. у аспірантуры і дактарантуры навучаліся 26 чалавек. Пры гэтым падрыхтоўка навуковых кадраў вядзецца не толькі для інстытута, але і для іншых арганізацый (музеяў і навучальных устаноў).

Пры інстытуце дзейнічаюць 2 саветы па абароне дысертацый: Д 01.40.01 па спецыяльнасцях 07.00.02 – айчынная гісторыя, 07.00.06 – археалогія, 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; К 01.40.01 па спецыяльнасці 03.03.02 – антрапалогія. За 2006–2010 гг. супрацоўнікі інстытута абаранілі 3 доктарскія і 6 кандыдацкіх дысертацый, за 2011–2013 гг. – 1 доктарскую і 6 кандыдацкіх дысертацый.

Інстытут гісторыі НАН Беларусі з'яўляецца галаўной арганізацыяй-выканаўцам падпраграмы «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011 – 2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі». У рамках выканання заданняў падпраграмы аддзелы

інстытута з'яўляюцца каардынуючымі цэнтрамі даследаванняў у сферы гісторыі, археалогіі і антрапалогіі для ўсёй нашай краіны. Падпраграма ўключае 16 заданняў, 9 з якіх выконваюцца Інстытутам гісторыі НАН Беларусі.

Даследаванні вучоных інстытута, многія вынікі якіх не маюць аналагаў у айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы, з'яўляюцца выключна важнымі для прагрэсіўнага развіцця Рэспублікі Беларусь, дзейнасці яе дзяржаўных органаў, бо ажыццяўляюцца на аб'ектыўнай навуковай аснове ў адпаведнасці з нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіяй Рэспублікі Беларусь; фарміруюць уласна беларускі погляд на гісторыю Беларусі і нацыянальную ідэнтычнасць; садзейнічаюць умацаванню беларускай дзяржаўнасці.

За апошнія пяць гадоў навукоўцамі інстытута адкрыты і даследаваны дзясяткі археалагічных аб'ектаў па ўсёй краіне, уведзены ў навуковы ўжытак сотні раней невядомых дакументальных крыніц, што дазволіла не толькі значна пашырыць тэматычныя сюжэты навуковых даследаванняў, але і ўдакладніць ранейшыя звесткі і ўяўленні па шматлікіх праблемах гісторыі, археалогіі і антрапалогіі.

З кожным годам расце колькасць выяўленых археолагамі інстытута новых помнікаў археалогіі розных гістарычных перыядаў, павялічваецца плошча даследаваных раскопкамі культурных напластаванняў, здабываюцца новыя ўнікальныя артэфакты. Археалагічныя даследаванні праводзяцца ва ўсіх абласцях Беларусі. Суцэльнае абследаванне асобных рэгіёнаў пакідае на археалагічнай карце краіны ўсё менш «белых плям».

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь па ахове нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны[1] Інстытут гісторыі НАН Беларусі каардынуе і кантралюе правядзенне археалагічных даследаванняў па ўсёй тэрыторыі краіны.

Кожны год Палявы камітэт інстытута выдае археолагам каля 100 дазволаў на права правядзення палявых даследаванняў, а Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі папаўняецца такой жа колькасцю справаздач.

У навуковых публікацыях акадэмічных археолагаў узняты на новы ўзровень пытанні першапачатковага асваення людзьмі прастораў Беларусі ў палеаліце і мезаліце, асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры, храналогіі і перыядызацыі этнакультурных працэсаў, пачынаючы ад жалезнага веку і Вялікага перасялення народаў да рассялення па тэрыторыі Беларусі славян, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Археолагі інстытута актыўна выкарыстоўваюць новыя методыкі ахоўных комплексных раскопак; распрацоўваюць пытанні захавання археалагічнай спадчыны, інвентарызацыі помнікаў археалогіі і стварэння зон іх аховы, а таксама практычнага выкарыстання вынікаў даследаванняў і саміх археалагічных аб'ектаў (музеефікацыя, турыстычныя маршруты і буклеты, навукова-папулярныя брашуры, фотаальбомы і інш.).

Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца комплекснае вывучэнне археалагічнай спадчыны Нацыянальнага парка «Прыпяцкі», якое ажыццяўлялася на працягу 2010–2012 гг. У выніку адкрыты новыя помнікі археалогіі, выяўлены тысячы артэфактаў, самыя каштоўныя з якіх ужо экспануюцца ў Музеі прыроды ў адміністрацыйным цэнтры Нацыянальнага парка – Ляскавічах.

Нельга не адзначыць выніковую працу Полацкай археалагічнай навуковай экспедыцыі на чале з В. М. Ляўко. Распачала сваю дзейнасць Брэсцкая комплексная гісторыка-археалагічная экспедыцыя на чале з В. І. Кошманам. Важныя для археалагічнай навукі матэрыялы выяўлены экспедыцыямі пад кіраўніцтвам М. М. Чарняўскага на паселішчах Крывінскага тарфяніка і А. В. Вайцяховіча на археалагічным комплексе Бірулі.

У Аршанскім Падняпроўі на тэрыторыі Друцкага археалагічнага комплексу В. М. Ляўко выяўлены ўнікальны курган XII ст. з вельмі рэдкім калектыўным адначасовым пахаваннем 38 прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў, у якім спалучаюцца элементы язычніцтва і хрысціянства.

[1] Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.05.2002 г. № 651 «Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ» і ад 15 чэрвеня 2006 г. № 762 «Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны».

Асабліва буйныя археалагічныя даследаванні праведзены на месцах будаўніцтва Беларускай АЭС і Гродзенскай ГЭС (В. Л. Лакіза), Полацкай ГЭС (М. В. Клімаў). Упершыню ў айчыннай археалагічнай навуцы на працягу 2012–2013 гг. пад кіраўніцтвам В. Л. Лакізы і З. А. Харытановіч цалкам даследавана гарадзішча Мілаградскай культуры ў в. Обчын Любанскага раёна.

Метадалагічным падмуркам асвятлення падзей гісторыі беларускай дзяржаўнасці стала вылучаная і абгрунтаваная калектывам навукоўцаў на чале з М. У. Смяховічам ідэя шматвяковай гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў дзвюх непарыўна звязаных формах – гістарычнай і нацыянальнай. Прычым, калі адметнасцю гістарычных формаў дзяржаўнасці на беларускіх землях была поліэтнічнасць, то ў нацыянальных формах закладзены нацыянальны змест тытульнага этнасу.

Аналіз калектывам вучоных на чале з В. В. Яноўскай на такой метадалагічнай аснове ўнутрыпалітычных падзей XIX – пачатку XX ст. даў падставы сцвярджаць неабходнасць разгляду іх як імкненння часткі жыхароў былога ВКЛ (галоўным чынам шляхты) пад уплывам пачуцця згубленай дзяржаўнасці аб’яднацца вакол польскага нацыянальнага руху. У выніку польскае пытанне, якое стала асноўным у геапалітыцы Расійскай імперыі, паглынула і надалей стрымлівала праяву і самастойнае развіццё беларускага нацыянальнага руху.

Зыходзячы з актуальнасці і неабходнасці сістэмнай рэканструкцыі ваеннай гісторыі Беларусі для вызначэння яе месца і ролі ў ваеннай гісторыі чалавецтва ў цэлым, ступені ўплыву ваенных падзей на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці, нацыі і нацыянальнай ідэі, прыярытэтнымі кірункамі даследаванняў ваенных гісторыкаў інстытута на чале з А. М. Літвіным з’явіліся:

– выяўленне раней невядомых архіўных крыніц і найноўшых дасягненняў гістарыяграфіі, іх сістэматызацыя, навуковы аналіз і сінтэз;

– распрацоўка навукова абгрунтаванай перыядызацыі ваеннай гісторыі Беларусі;

– устанаўленне канкрэтных імёнаў беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі – удзельнікаў ваенных падзей і стварэнне адпаведнага электроннага банка даных.

У выніку ўпершыню выяўлены і ахарактарызаваны адзіны комплекс айчынных і замежных дакументальных і гістарыяграфічных крыніц, якія адлюстроўваюць маштабы і ступень удзелу беларусаў і жыхароў Беларусі ў войнах і ваенных канфліктах XX ст. Гэта дазволіла ўстанавіць «белыя плямы», вызначыць канцэптуальныя падыходы і ацэнкі ваеннага ракурсу гісторыі Беларусі.

Узяты за аснову даследаванняў кантэкст удзелу ў ваенных канфліктах XX ст. дзяржаўных, палітычных і грамадскіх структур Беларусі, прадстаўнікоў беларускага народа, вайскоўцаў воінскіх фарміраванняў, дыслацыраваных на беларускай зямлі, даў магчымасць, з аднаго боку, ацаніць ступень уплыву і ўклад нашых суайчыннікаў у развіццё і вынікі ваенна-гістарычных падзей, а з другога боку – устанавіць ступень уздзеяння ваенных катаклізмаў на гістарычнае развіццё беларускай дзяржаўнасці, нацыі і нацыянальнай ідэі, месца і ролю Беларусі ў міждзяржаўных адносінах у XX ст.

Вельмі важным вынікам з’яўляецца тое, што ўпершыню выяўлены і занесены ў электронны банк даных імёны 10938 чалавек (у тым ліку 10460 загінуўшых) беларусаў, выхадцаў з Беларусі, вайскоўцаў Беларускай ваеннай акругі і цяперашніх грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прымалі ўдзел у лакальных войнах і ваенных канфліктах XX ст. у Еўропе, Азіі, Афрыцы і Лацінскай Амерыцы.

Вучонымі на чале з М. К. Кошалевым ажыццёўлены комплексны навуковы аналіз гістарычнага вопыту і перспектыў развіцця інтэграцыйных працэсаў у Еўропе і свеце, удзелу ў іх Беларусі. Вывучаны характэрныя рысы розных гістарычных мадэляў, формаў і праектаў інтэграцыйных аб’яднанняў. Дадзена характарыстыка аб’ектыўных і суб’ектыўных перадумоў глабалізацыі і яе наступстваў, адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці і культуры Беларусі ва ўмовах інтэграцыі.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі праведзена комплекснае вывучэнне гісторыі фарміравання, сучаснага стану і перспектыў развіцця ўзаемаадносін шэрага краін на постсавецкай прасторы. Вылучаны этапы развіцця беларуска-малдаўскіх і беларуска-казахстанскіх палітычных, гандлёва-эканамічных, навуковых і культурных сувязяў на мяжы XX–XXI стст.

Па сутнасці адноўлены (пасля 60-гадовага перапынку) такі важны напрамак у беларускай акадэмічнай гістарычнай навуцы, як вывучэнне праблем усеагульнай гісторыі. Больш таго, адкрыты яго новы кірунак – даследаванне гісторыі краін Блізкага і Сярэдняга Усходу.

Развіваюцца даследаванні па гісторыі беларускай дыяспары як неад'емнай часткі беларускага народа. Вынікі навуковых напрацовак вучоных інстытута па дадзенай праблематыцы садзейнічалі распрацоўцы дзяржаўнай палітыкі, вызначэнню канцэптуальных і практычных падыходаў у адносінах да беларускіх арганізацый розных краін замежжа, дыяспары ў цэлым.

У гісторыка-метадалагічным плане несумненным дасягненнем з'яўляюцца вылучэнне і навуковае абгрунтаванне прынцыпу неабходнасці максімальнага ўліку менавіта тых бакоў узаемадачыненняў, якія былі накіраваны не на канфрантацыю, а на пазітыўныя інтэграцыйныя фактары, збліжалі краіны і народы.

Навукоўцамі на чале з С. А. Трацяком упершыню прааналізаваны тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты агульнага і асаблівага ў фарміраванні сучаснай беларускай дзяржаўнасці і працэсе мадэрнізацыі Рэспублікі Беларусь; выдзелены асноўныя этапы станаўлення і развіцця асобных сфер культуры і сістэмы адукацыі, выяўлены станоўчыя і негатыўныя моманты ў развіцці пратэстанцкіх цэркваў і дэнамінацый, вызначаны дасягненні і цяжкасці дзяржаўнай канфесійнай палітыкі ў сучаснай Беларусі.

Выяўленне, абагульненне і аналіз новых дакументаў і матэрыялаў па гісторыі беларускай навукі і яе персаналій дазваляюць вырашаць актуальныя навуковыя задачы, ушчыльную падысці да правядзення комплексных навуковых даследаванняў. Так, калектывам вучоных на чале з У. І. Кузьменкам плённа даследуецца гісторыя развіцця аграрнай навукі. Вынікам мэтанакіраванай працы апошніх гадоў стала падрыхтоўка і выданне М. У. Токаравым цыкла зборнікаў дакументаў і матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці прэзідэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – У. М. Ігнатоўскага, П. В. Горына, К. В. Горава, В. Ф. Купрэвіча, зборніка дакументаў і матэрыялаў аб стварэнні і дзейнасці першай комплекснай навуковай установы – Інстытута беларускай культуры.

Аддзел антрапалогіі і экалогіі інстытута з'яўляецца адзіным у нашай краіне навуковым цэнтрам, які ажыццяўляе комплексныя даследаванні біялогіі чалавека. Антраполагамі інстытута на чале з Л. І. Тэгака ўпершыню выяўлены асаблівасці біялагічнай і культурнай адаптацыі насельніцтва Беларусі да змен навакольнага асяроддзя, а таксама характэрныя рысы антрапалогіі старажытнага і сучаснага насельніцтва Полацкай зямлі.

Без перабольшання сёння можна ганарыцца фундаментальнымі працамі археолагаў, гісторыкаў і антраполагаў інстытута. Усяго за 2006–2013 гг. вучоныя інстытута апублікавалі больш 110 манаграфій, 70 зборнікаў навуковых прац і матэрыялаў канферэнцый, 60 падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 200 атласаў і карт, 20 археаграфічных выданняў (сярод іх 5 кніг Метрыкі ВКЛ – унікальнай дакументальнай крыніцы па гісторыі Беларусі перыяду Сярэднявечча і Новага часу), 2200 навуковых артыкулаў і тэзісаў канферэнцый, 1500 энцыклапедычных і навукова-папулярных артыкулаў.

Цэлы шэраг выданняў, падрыхтаваных навукоўцамі Інстытута гісторыі, з'яўляецца гонарам Рэспублікі Беларусь, атрымаў прызнанне шырокай айчыннай і замежнай грамадскасці, не мае аналагаў у свеце. Гэта наступныя працы:

– падрыхтаваны аўтарскім калектывам на чале з А. А. Каваленяй вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (Мн., 2006–2009), які ўключае праграму, падручнік, даведнік, рабочы сшытак, хрэстаматыю, дапаможнік для настаўніка з'яўляецца лепшым сярод краін СНД;

– падрыхтаваныя аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені і В. В. Даніловіча спецыяльна да 600-годдзя пачатку фарміравання запаведнага рэжыму на тэрыторыі Белавежскай пушчы ўнікальная калектыўная манаграфія «Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць» (Мн., 2009), дзе на аснове найноўшых канцэптуальных метадалагічных падыходаў з выкарыстаннем багатага археалагічнага матэрыялу, шырокага кола архіўных і апублікаваных крыніц упершыню ў гістарычнай навуцы прадстаўлена гісторыя Белавежскай пушчы са старажытных часоў да нашых дзён, а таксама ўнікальны фотаальбом «Зямля сілы. Белавежская пушча» (Мн., 2009), дзе сабраны не толькі рэдкія кадры фотахронікі, здымкі флоры і фаўны, але і прадстаўлены важнейшыя гістарычныя падзеі на тэрыторыі Белавежскай пушчы ад старажытнасці да сучаснасці;

– падрыхтаваны калектывам складальнікаў на чале з А. А. Каваленяй спецыяльна да 70-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР зборнік дакументаў і матэрыялаў «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі...» у 2 кнігах (Мн., 2009), які з'яўляецца вынікам сумеснай працы вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі і архівістаў Беларусі і Расіі, у ім змешчаны ўнікальныя архіўныя дакументы 1939–1956 гг., якія адлюстроўваюць падзеі ўз'яднання беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве, палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні;

– падрыхтаваныя аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені і В. В. Яноўскай 1-ы і 2-гі тамы ўнікальнага «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» (Мн., 2009, 2013), які не мае аналагаў, гэтыя тамы ахопліваюць перыяд ад з'яўлення чалавека на тэрыторыі Беларусі і да 1795 г., іх выхад у свет стаў падзеяй нацыянальнага маштабу, важкім крокам наперад не толькі ў развіцці гістарычнай картаграфіі, але і гістарычнай навукі ўвогуле. Гэта супольнае дасягненне і плён творчага супрацоўніцтва вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія», Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь і Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

– падрыхтаваная аўтарскім калектывам на чале з А. А. Каваленяй калектыўная манаграфія «Беларусь: Народ. Государство. Время» (Мн., 2009), дзе ўпершыню на аснове найноўшых дасягненняў гістарычнай думкі, канцэптуальных метадалагічных падыходаў, а таксама нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі прадстаўлена гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці, раскрыты месца і роля беларускага народа ў развіцці еўрапейскай цывілізацыі, гэта выданне стала пераможцам у намінацыі «Лепшае масава-палітычнае выданне» нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2010», а таксама атрымала Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга – 2010», які адбыўся ў Маскве;

– падрыхтаваная на аснове гэтай калектыўнай манаграфіі багата ілюстраваная кніга «Беларусь: страницы истории» (Мн., 2011), якая разлічана на шырокае кола чытачоў, дзе на аснове нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі ў сціслай, але змястоўнай форме прадстаўлена гісторыя Беларусі са старажытных часоў па 2010 г. уключна;

– падрыхтаваная сумесна з выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя» спецыялізаваная энцыклапедыя «Археалогія Беларусі» ў 2 тамах (Мн., 2009, 2011), выхад у свет гэтага выдання стаў несумненным дасягненнем акадэмічных археолагаў;

– падрыхтаваная аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені і М. У. Смяховіча ўнікальная двухтомная калектыўная манаграфія «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» (Мн., 2011–2012), дзе грунтоўна прааналізаваны передумовы, якія садзейнічалі фарміраванню нацыянальна-дзяржаўнай ідэі беларускага народа, складаны працэс афармлення беларускай дзяржаўнасці, комплексна асветлены і абгрунтаваны яе асаблівасці на розных гістарычных этапах;

– падрыхтаванае В. М. Ляўко ўнікальнае выданне «Археологическое наследие Беларуси = Archaeological Heritage of Belarus» (Мн., 2012), дзе на неабходным навуковым і інфармацыйным узроўні сканцэнтравана шматтысячагадовая, шматгранная, багатая і ўнікальная гісторыя нашай краіны, кожны прадстаўлены ў кнізе археалагічны артэфакт мае не толькі пэўную назву, але і ўвесь патрэбны навукова-даведачны апарат, з якога вынікае, што гэта за рэч, калі, кім і дзе яна была выяўлена, выданне атрымала Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга 2012» у Маскве;

– падрыхтаваная аўтарскім калектывам на чале з В. М. Ляўко ў серыі «Древнейшие города Беларуси» калектыўная манаграфія «Полоцк» (Мн., 2012), якая раскрывае старонкі гісторыі найстаражытнага беларускага горада ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу, выразна дэманструе месца і значэнне Полацка ў гісторыі і культуры Беларусі і ўсёй Еўропы, гэта кніга атрымала дыплом лаўрэата Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга – 2013» у Маскве;

– падрыхтаваны калектывам складальнікаў пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені і В. В. Даніловіча пры актыўным садзейнічанні Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскага фонду «Историческая память» унікальны зборнік дакументаў і матэрыялаў «Польша – Беларусь. 1921–1953» (Мн., 2012), дзе выразна раскрыты паланізатарская

палітыка польскіх уладных эліт на тэрыторыі Беларусі і адпаведныя негатыўныя наступствы для беларускага народа.

За 2006–2013 гг. вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі паспяхова выкананы 5 інавацыйных, 1 асобны і 48 навукова-даследчых праектаў, прафінансаваных Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, а таксама Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў.

У ходзе прац па інавацыйнаму навукова-даследчаму праекту «Правесці гісторыка-археалагічныя даследаванні на помніках г. Нясвіжа, якія ўключаны ЮНЕСКА ў спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, скласці звод дакументальных даных для ажыццяўлення комплексных рэстаўрацыйных прац і кіравання намінацыяй» у рамках дагавора з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь пры фінансавай падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь А. А. Мяцельскім упершыню вывучаны канструктыўныя асаблівасці планіроўкі профілю рва і сцен бастыёнаў Нясвіжскага замка, на аснове якіх распрацаваны і рэалізаваны праекты іх рэканструкцыі па стану на XVI–XVII стст.

У выніку рэалізацыі калектывам навукоўцаў на чале з В. В. Даніловічам інавацыйнага праекта «Вывучыць гісторыка-культурную спадчыну Нацыянальнага парка “Белавежская пушча” і выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтай спадчыны» ў рамках дагавора з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры фінансавай падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь упершыню ў гістарычнай навуцы праведзены глыбокі навуковы гістарыяграфічны, крыніцазнаўчы, археалагічны і этнаграфічны аналіз праблем гісторыка-культурнай спадчыны Белавежскай пушчы. У выніку выяўлены цэлы шэраг унікальных гістарычных, археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў, выпрацаваны канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна Белавежскай пушчы, якія сталі асновай для распрацоўкі навуковай канцэпцыі і стварэння экспазіцыі ўнікальнага музея Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», адкрытага восенню 2009 г. У яго экспазіцыі ўпершыню ў нашай краіне прадстаўлены не толькі прыродныя багацці прыродаахоўнай тэрыторыі, але і яе гісторыя. Аналагі падобных музеяў у суседніх дзяржавах адсутнічаюць. Праект «Вывучыць гісторыка-культурную спадчыну Нацыянальнага парка “Белавежская пушча” і выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтай спадчыны» ўзнагароджаны дыпломам НАН Беларусі як адзін з лепшых інавацыйных праектаў.

У рамках дагавора з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры фінансавай падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь калектывам вучоных на чале з А. А. Каваленяй паспяхова выкананы інавацыйны праект «Вывучыць гісторыка-культурную спадчыну Нацыянальнага парка “Прыпяцкі” і выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтай спадчыны». У выніку выяўлены цэлы шэраг унікальных гістарычных, археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў, выпрацаваны канкрэтныя рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна, якія сталі асновай для стварэння экспазіцыі новага музея Нацыянальнага парка «Прыпяцкі», адкрытага летам 2012 г.

У перспектыве плануецца ахапіць падобнымі праектамі ўсе нацыянальныя паркі нашай краіны і Бярэзінскі біясферны запаведнік.

У Інстытуце гісторыі НАН Беларусі створана і з 1 лістапада 2007 г. паспяхова функцыянуе ўнікальная Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя, якая яскрава сведчыць аб багатай гісторыка-культурнай спадчыне нашых продкаў і з’яўляецца асновай навукова-інфармацыйнага і адукацыйнага цэнтра для падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне вывучэння і аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, а таксама мае вельмі важнае значэнне ў патрыятычным выхаванні моладзі. Экспазіцыю наведалі каля 400 груп студэнтаў і навучэнцаў, а таксама члены Парламента Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў Беларусі, госці з 16 замежных краін.

Вучонымі інстытута распрацаваны арыгінальныя навуковыя канцэпцыі экспазіцый Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама шэрага рэгіянальных музеяў Рэспублікі Беларусь.

Плённа развіваецца супрацоўніцтва Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў рамках адпаведных дагавораў з 25 замежнымі і 25 айчыннымі ўстановамі і арганізацыямі. У выніку вучоныя маюць магчымасць ажыццяўляць цікавыя і карысныя для айчыннай гістарычнай навукі навуковыя праекты, працаваць з дакументамі па гісторыі Беларусі, якія знаходзяцца ў архівах іншых краін.

Так, пры фінансавай падтрымцы германскага фонду «Памяць. Адказнасць. Будучыня» калектывам навукоўцаў на чале з А. М. Літвіным вывучана праблема прымусовай працы насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У выніку падрыхтавана і выдадзена грунтоўная калектыўная манаграфія «Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі. 1941–1945 гг.» (Мн., 2010), у якой упершыню на дакументальным матэрыяле абгрунтаваны факт прыцягнення германскімі акупантамі да прымусовай працы каля 2 мільёнаў жыхароў Беларусі.

Сапраўдным прарывам у гістарыяграфіі Беларусі, Расіі і Украіны стала падрыхтоўка і публікацыя калектыўнай манаграфіі, а таксама зборніка дакументаў і матэрыялаў «1941: Страна в огне»: Кн. 1: «Очерки» (М., 2011); кн. 2: «Документы и материалы» (М., 2011), якія прадстаўляюць цэласную карціну падзей 1941 г., адпавядаючую іх бачанню гісторыкамі Расіі, Беларусі і Украіны; змяшчаюць вялікую колькасць найноўшых факталагічных і статыстычных даных, тэарэтычных абгрунтаванняў. Гэта першая пасля распаду СССР буйная міжнародная гістарычная праца аб пачатковым этапе Вялікай Айчыннай вайны. З беларускага боку аўтарскі калектыў узначальвалі А. А. Каваленя і А. М. Літвін.

Па заказу і пры фінансавай падтрымцы Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта калектывам вучоных на чале з А. М. Літвіным на вялізным дакументальным матэрыяле са шматлікіх айчынных і замежных архіваў спецыяльна да 945-годдзя Пінска падрыхтавана ўнікальная калектыўная манаграфія «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці» (Мн., 2012).

Па заказу і пры фінансавай падтрымцы Беларускай чыгункі на вялікім дакументальным матэрыяле са шматлікіх айчынных і замежных архіваў калектывам навукоўцаў пад кіраўніцтвам В. В. Яноўскай падрыхтавана ўнікальная калектыўная манаграфія «История Белорусской железной дороги. Из века XIX в век XXI» (Мн., 2012), якая прадстаўляе гісторыю Беларускай чыгункі ад стварэння да сучаснасці. Гэта выданне атрымала гран-пры ў намінацыі «Залатыя скрыжалі» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2013».

Пры фінансавай падтрымцы Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў (Францыя) у 2012–2013 гг. упершыню ў гісторыі пад кіраўніцтвам В. І. Кошмана паспяхова праведзена беларуска-французская археалагічная экспедыцыя на месцы пераправы войск Напалеона праз р. Бярэзіну ў 1812 г.

У сучасных умовах Інстытут гісторыі НАН Беларусі актыўна развівае інавацыйны напрамак сваёй дзейнасці: укараняе вынікі навуковых даследаванняў у гістарычную адукацыю, папулярызуе дасягненні гістарычнай навукі, прапагандуе гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа. З гэтай мэтай наладжаны трывалыя сувязі з установамі адукацыі, педагогамі і насельніцтвам канкрэтных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць вучоных-гісторыкаў накіроўваецца на сацыяльную інавацыйнасць, спалучэнне фундаментальных даследаванняў з практыкай, сувязь навукі з жыццём грамадства. Вучоныя інстытута праз навукова-педагагічную дзейнасць апрабуюць і ўкараняюць вынікі навуковых даследаванняў у 15 ВНУ краіны.

За 2006–2013 гг. Інстытутам гісторыі НАН Беларусі арганізаваны больш 140 навуковых мерапрыемстваў у розных рэгіёнах Рэспублікі Беларусь. Сярод іх Міжнародны круглы стол «1020-годдзе Хрышчэння Русі ў лёсах народаў Беларусі, Расіі і Украіны» з удзелам Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II і Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі (Мінск, 23 кастрычніка 2008 г.); арганізаваная сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР)» (Мінск, 18 снежня 2008 г.); праведзеная сумесна з Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў, Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Партызанскі рух у Беларусі і яго роля ў разгроме фашысцкіх захопнікаў у 1941–1944 гадах», прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі (Мінск, 25–26 чэрвеня 2009 г.); арганізаваная сумесна з Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным паркам «Бела-

вежская пушча», Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, ЮНЕСКА Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 600-годдзю ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы, «Белавежская пушча: гісторыя, прырода, турызм» (Каменюкі, 17–18 верасня 2009 г.); праведзеная сумесна з Інстытутам усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук пры фінансавай падтрымцы Міждзяржаўнага фонду супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД V Міжнародная летняя школа маладых вучоных-гісторыкаў краін СНД «Актуальныя праблемы Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў (да 65-годдзя Вялікай Перамогі)» (Мінск, 14–23 чэрвеня 2010 г.); арганізаваная сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці», (Мінск, 24–25 лістапада 2011 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Полацк у гісторыі і культуры Еўропы», прысвечаная 1150-годдзю Полацка і праведзеная сумесна з Полацкім гарадскім выканаўчым камітэтам, Полацкім дзяржаўным універсітэтам і Нацыянальным полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам (Полацк, 22–23 мая 2012 г.); арганізаваная сумесна з Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, Нацыянальна-культурнай аўтаноміяй «Беларусы Масквы» і гістарычным факультэтам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава Расійска-беларуская навукова-практычная канферэнцыя «Россия – Беларусь – Союзное государство: гуманитарное измерение», прысвечаная 20-годдзю ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй (Масква, 27 чэрвеня 2012 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Отечественная война 1812 года в судьбах народов России и Беларуси (к 200-летию победы России в Отечественной войне 1812 г.)», праведзеная сумесна з Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, Музеем гісторыі Магілёва і Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам імя А. А. Куляшова (Мінск – Магілёў, 25 – 27 ліпеня 2012 г.); арганізаваны сумесна з Рэспубліканскім грамадскім аб’яднаннем «Белая Русь» навукова-практычны семінар «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» (Мінск, 26 сакавіка 2013 г.); праведзеная разам з Беларускай праваслаўнай царквой Міжнародная навуковая канферэнцыя «Хрышчэнне Русі ў лёсах Беларусі, Расіі і Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху», прысвечаная 1025-годдзю Хрышчэння Русі (Мінск, 6–7 чэрвеня 2013 г.).

Сустрэчы вучоных-гісторыкаў з грамадскасцю краіны, правядзенне навуковых канферэнцый, прысвечаных даследаванню мінулага асобных населеных пунктаў і рэгіёнаў Беларусі, распачатыя па ініцыятыве Інстытута гісторыі НАН Беларусі, сталі добрай і карыснай традыцыяй. На гэтых навуковых мерапрыемствах ўзняты велізарны пласт раней невядомых дакументаў і матэрыялаў, папулярызуецца мінулае і сённяшняе жыццё беларусаў. Такая форма навукова-асветнай работы атрымала шырокі грамадскі рэзананс і высокую ацэнку навуковай супольнасці. Правядзенне падобных мерапрыемстваў з’яўляецца непасрэднай, практычнай ідэалагічнай работай, якая накіравана на кансалідацыю беларускай нацыі, забеспячэнне гарманізацыі грамадскіх адносін, фарміраванне патрыятызму, грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці і нацыянальнай свядомасці. Гэта неабходна для ўмацавання духоўна-маральных і ідэалагічных асноў беларускага грамадства.

Увогуле вучоныя інстытута актыўна ўдзельнічаюць у прапагандзе навуковых дасягненняў у галіне археалогіі, гісторыі і антрапалогіі, распаўсюджванні навуковых ведаў. Пры гэтым выкарыстоўваюцца ўсе магчымыя сродкі масавай інфармацыі – лекцыі, канферэнцыі, друк, тэлебачанне і радыё.

Нельга не адзначыць актыўную даследчыцкую і папулярызатарскую працу такіх вучоных інстытута, як Р. А. Аляхновіч, Я. П. Бязлепкін, І. Ю. Варанкова, А. В. Вайцяховіч, Г. Я. Галенчанка, М. У. Глеб, В. Ф. Голубеў, А. І. Груша, С. Д. Дзярновіч, А. Б. Доўнар, А. А. Жлутка, М. Г. Жылінскі, А. А. Каваленя, А. Г. Калечыц, М. П. Касцюк, П. М. Кенька, М. В. Клімаў, М. К. Кошалеў, В. І. Кошман, К. А. Крывічаніна, В. Л. Лакіза, А. М. Літвін, П. Ф. Лысенка, В. М. Ляўко, В. Г. Мазец, В. У. Марфіна, А. У. Мацук, А. М. Мядзведзеў, А. А. Мяцельскі, М. Б. Несцяровіч, М. М. Памазанаў, К. С. Разуванава, А. П. Салаўянаў, І. І. Салівон, А. А. Скеп’ян, М. М. Смальяніnaў, М. У. Смяховіч, Л. П. Собалева, М. У. Токараў, С. А. Траццяк, Л. І. Тэгака, А. У. Унучак, А. М. Філатава, А. Э. Фірыновіч, З. А. Харытановіч, М. М. Чарняўскі, А. І. Шаланда, Г. В. Штыхаў, В. В. Яноўская.

Але калектыў інстытута не спыняецца на дасягнутым, даследаванні па антрапалогіі, археалогіі, айчыннай і сусветнай гісторыі будуць рухацца ў зададзеным кірунку, які адпавядае нацыянальным і дзяржаўным інтарэсам Рэспублікі Беларусь.

Для паспяховай рэалізацыі ўскладзеных на Інстытут гісторыі НАН Беларусі задач па вывучэнні і ахове археалагічнай спадчыны краіны, з мэтай мнімізацыі выдаткаў пры праектаванні і будаўніцтве народнагаспадарчых аб'ектаў, зберажэння культурнай спадчыны беларускага народа, арганізацыі эфектыўнай аховы помнікаў археалогіі актуальным і запатрабаваным з'яўляецца стварэнне «Археалагічнай карты Беларусі» на падставе суцэльнага абследавання ўсёй тэрыторыі краіны і нанясення на карты ўсіх вядомых помнікаў археалогіі, іх зон аховы.

Безумоўна, самай сур'ёзнай увагі патрабуюць праблемы крыніцазнаўства. Вельмі актуальным з'яўляецца стварэнне трывалых асноў для маштабнай навукова-даследчай і арганізацыйнай работы па планамерным і сістэматычным выданні гістарычных дакументаў. У гэтай сувязі прапрацоўваюцца варыянты рэалізацыі праграмы выдання крыніц па айчыннай гісторыі з адпаведным фінансаваннем, магчыма, праз Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.

У лік крыніц для першачарговай публікацыі павінны ўвайсці старажытныя дакументы, што праліваюць святло на гісторыю Беларусі XIII – пачатку XVI ст., а таксама шматлікія земскія, гродскія і магістрацкія кнігі з беларускіх зямель XVI–XVIII стст., якія захоўваюць у сабе велізарны матэрыял па сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай гісторыі нашай айчыны, дзейнасці цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання, гістарычнай геаграфіі, генеалогіі баярскіх, мяшчанскіх і нават сялянскіх родаў. Неабходна прадоўжыць працу па выданні кніг Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, звесткі якіх маюць неацэннае значэнне для гісторыі Беларусі. На рэгулярную і сістэматычную аснову павінна быць пастаўлена справа па выданні крыніц па новай і найноўшай гісторыі Беларусі.

Будзе працягвацца праца па падрыхтоўцы і выданні 3-га і 4-га тамоў «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі».

Разам з калегамі з ВНУ плануецца падрыхтоўка шматтомнай гісторыі Беларусі, дзе на аснове новых канцэптуальных і метадалагічных распрацовак гістарычнай навукі, а таксама нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь будуць абагульнены найважнейшыя працэсы і падзеі айчыннай гісторыі, сучасныя дасягненні нашай краіны. Гэта шматтомная праца будзе своеасаблівай нарматыўнай базай пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для навучальных устаноў, навуковым «компасам» пры далейшай распрацоўцы недаследаваных або малавывучаных праблем гісторыі Беларусі.

Увогуле плануюцца падрыхтоўка і выданне комплексу фундаментальных аб'ектыўных навуковых прац па нацыянальнай гісторыі, якія сфарміруюць навуковую базу для ўдасканалення і абнаўлення праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых, сярэдніх і сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў, будуць накіраваны на развіццё ў падрастаючага пакалення і грамадства ў цэлым разумення багацця беларускай гісторыі і культуры, пачуццяў патрыятызму і гонару за свой народ і краіну.

Творчы калектыў Інстытута гісторыі НАН Беларусі сёння ўпэўнена глядзіць у будучыню. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база інстытута, яго кадравы склад папаўняецца маладымі таленавітымі навукоўцамі, адкрываюцца новыя далягляды ў ажыццяўленні цэлага шэрага буйных навуковых праектаў, для выканання якіх існуюць рэальныя магчымасці.

*V. V. DANILOVICH*

**INSTITUTE OF THE HISTORY IN FRAMES OF THE NATIONAL HISTORICAL SCIENCE SYSTEM**

## Summary

This article describes activities of state scientific institution «The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus» at the present stage.

Primary results in the field of history, archeology and anthropology, found by scientists of the Institute during the realization of government research program and individual research projects, have been analyzed.

The most significant collective works developed by staff members of the Institute are presented in the article.

The article covers information about basic promising directions for further scientific research and development within the framework of the Institute of History.